# Фарны касцёл

*Калнін, В.В. Фарны касцёл / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 79-85.*

Сёння на Савецкай (былой Рынкавай) плошчы прыцягвае ўвагу касцёл Францішка Ксаверыя. Раней ён быў езуіцкім, потым фарным (прыходскім), зараз мае статус кафедральнага. Гэта адзін з найвялікшых храмаў на Беларусі: унутры яго магло змясціцца ўсё насельніцтва Гродна, якое мелася ў горадзе падчас узвядзення храма.



Успамінаю сваё першае наведанне фарнага касцёла сорак гадоў таму. Касцёл не працуе, зайсці ў яго можна толькі па прыяцельскай дамоўленасці. Уваход праз бакавыя дзверы. З стрыманым дыханнем падступаю да суровай маўклівай грамадзіны.

Унутры змрочная прастора. Паступова прыглядаюся да цьмяных ценяў. Першым праяўляецца бакавы алтар пры слупе. Верх яго ўздыбіўся застылай пачарнелай хваляй. Там жа, наверсе, крылатыя анёлкі - як чорныя птушкі, здранцвелыя ў палёце. Абразоў за пылам не відаць, толькі прыглушанае зіхаценне разьбяных пазалочаных узораў, падобных на раскіданую па хвалі брудную пену.

За слупамі прытуліліся да сцяны згорбленыя постаці спавядальных скрыняў. І тут таксама багатая хвалістая разьба. Праціраю пыл над бакавым акенцам: высвятляецца выява, складзеная з розных парод дрэва (інтарсія) - дзяўчыну вітае з магілы шкілет воіна.

За прэсбітэрыем, у глыбіні апсіды, вока намацвае агромністую разьбяную структуру - лес калон на два паверхі, з гушчару якога крочаць насустрач пашарэлыя постаці калісьці белых скульптур.



Крывізна алтара, уціснутага ўглыб, цёмны колер калонаў, вострыя вуглы заламаных карнізаў, няпэўнасць рухаў на скульптурных выявах - усё разам стварае драматычную сцэну процістаяння моцнаму знешняму націску.

Цэнтральная фігура Францыска Ксаверыя, патрона касцёла, быццам самлелая, адкінулася ў нішу, у цемень. Па баках выявы святых з скуластымі тварамі і адкрытымі ратамі застылі ў нямым пазову. Пётр жаласна працягвае ключы - забірайце! Адсунуўшы меч убок, гатовы да перамоў святы Павел, раскрывае душу святы Андрэй, Рох у разгубленасці разводзіць рукамі.




Сёння ў касцёле ўсё пачышчана і блішчыць. Толькі нестае некаторых скульптураў, пра якія папярэдне ішла гаворка. Выявы святых перажылі цяжкія часы выпрабаванняў, а зараз, калі, здаецца, наладзіліся ўмовы існавання, яны сышлі, вобразна кажучы, “згарэлі на рабоце”, пакінуўшы пра сябе адбіткі на фотаздымках.

Архітэктура фарнага касцёла пабудавана на кантрастах. Звонку, асабліва на галоўным фасадзе, яна дэманструе велічную суровасць, а ўнутры ашаламляе багаццем дынамічных, на мяжы драматызму, формаў, дэталяў, колераў.